# ДЗЯРЖАЎНАЯ МІГРАЦЫЙНАЯ ПАЛІТЫКА БЕЛАРУСІ І ЯЕ ЎПЛЫЎ НА СТАН СУЧАСНАЙ ДЫЯСПАРЫ (90-я гг.)

**Галіна Сяргеева**

Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі стала пачаткам фарміравання ўласнай міграцыйнай палітыкі. Важным крокам на гэтым шляху, актам заканадаўчага замацавання правоў замежных суродзічаў і тых беларускіх грамадзян, якія жывуць па-за межамі краіны, стаў Закон аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь (уведзены ў дзеянне ў кастрычніку 1991 г.) [1]. Прынцыпова новым і істотным для суродзічаў, якія аказаліся за межамі дзяржавы, з'явілася захаванне права на набыццё грамадзянства за тымі асобамі, якія пастаянна пражывалі на тэрыторыі рэспублікі, але былі прымусова выселены ці выехалі за яе межы да ўвядзення ў дзеянне гэтага закона, а таксама за іх нашчадкамі. Такое ж права набылі і беларусы, а таксама асобы, якія ідэнтыфікуюць сябе як беларусы, і іх дзеці, што нарадзіліся за межамі сучаснай тэрыторыі Беларусі. Па закону грамадзянства ім прадастаўлялася на агульных асновах, за выключэннем неабходнага для іншых пастаяннага сямігадовага тэрміну пражывання ў Беларусі. Закон гарантуе, што ніхто з грамадзян рэспублікі не можа быць адвольна пазбаўлены права змяніць грамадзянства, што пашырыла магчымасці людзей эмігрыраваць, выбіраць месца пражывання. Артыкулы закона аб абароне правоў і законных інтарэсаў грамадзян Беларусі не толькі на сваёй тэрыторыі, але і за яе межамі, а таксама аб тым, што пражыванне на тэрыторыі іншай дзяржавы само па сабе не вядзе да страты грамадзянства, спрыяюць павышэнню абароненасці тых суродзічаў, якія стала ці часова жывуць за мяжой (праца, вучоба, замужжа і інш.).

Прыняцце ў маі 1993 г. Закона аб парадку выезду грамадзян з Беларусі і ўезду ў яе (дзейнічае з 1 студзеня 1994 г.) адкрыла істотна новыя магчымасці папаўнення дыяспары новымі эмігрантамі, у тым ліку захаваўшымі грамадзянства Беларусі (паехаўшыя з СССР на сталае пражыванне за мяжу адразу пазбаўляліся грамадзянства), спарадзіла новую, немагчымую ў савецкія часы з'яву — часовую працоўную міграцыю. Гэты закон у адпаведнасці з прынцыпамі Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і іншымі агульнапрызнанымі міжнароднымі актамі гарантуе грамадзяніну Беларусі права свабодна пакідаць сваю краіну і вяртацца ў яе, рэгулюе парадак афармлення дакументаў для выезду за мяжу і ўезд у Рэспубліку Беларусь [2]. Часовае абмежаванне выезду дапускаецца толькі ў выпадках валодання асобай дзяржаўнымі сакрэтамі, узбуджэння крымінальнай справы, учыненага злачынства. Закон гарантуе недапушчальнасць якога-небудзь адвольнага абмежавання грамадзянскіх, працоўных, жыллёвых і іншых правоў тых грамадзян, якія выязджаюць за мяжу на сталае жыхарства.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, прынятая Вярхоўным Саветам 15 сакавіка 1994 г., замацавала за грамадзянамі права "свабодна перамяшчацца і выбіраць месца жыхарства ў межах Рэспублікі Беларусь, пакідаць яе і бесперашкодна вяртацца назад" (артыкул 30). Яна гарантуе абарону сваіх грамадзян як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі, а таксама тое, што ніхто не можа быць пазбаўлены грамадзянства або права змяніць яго (артыкул 10).

З мэтай дзяржаўнага рэгулявання міграцыі, абароны правоў бежанцаў, мігрантаў-працоўных у ліпені 1992 г. прынята пастанова ўрада аб стварэнні Дзяржаўнай міграцыйнай службы пры Дзяржкамітэце па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва. У адпаведнасці з Палажэннем аб Дзяржаўнай міграцыйнай службе (зацверджана ўрадам у жніўні 1993 г.) асноўнымі яе задачамі вызначаліся выпрацоўка і рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі ў галіне міграцыі насельніцтва, каардынацыя і кантроль дзейнасці ўсіх структур (дзяржаўных, грамадскіх, камерцыйных) па пытаннях міграцыі, у тым ліку і знешняй, абмену працоўнымі рэсурсамі [3]. У адпаведнасці з палажэннем створаны і дзейнічаюць тэрытарыяльныя органы па міграцыі пры камітэтах працы аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама. У складзе Савета Міністраў рэспублікі паявілася эміграцыйная служба. У студзені 1997 г. Дзяржаўная міграцыйная служба Міністэрства працы пераўтворана ў Камітэт па міграцыі пры Міністэрстве працы. Уяўленне аб асноўных тэндэнцыях эміграцыйна-іміграцыйных працэсаў у Беларусі і адпаведных зменах у беларускай дыяспары даюць наступныя звесткі. З 1992 па 1997 г. з Беларусі выехала больш за 245 тыс. асоб, а імігравала сюды больш 347 тыс. чалавек [4]. Рэгулярны прыток беларусаў і выхадцаў з Беларусі ў заходнюю дыяспару выявіўся напрыканцы 80-х гг., хоць і стрымліваўся штучна (адсутнасць у СССР свабоднага ўезду-выезду, складаная працэдура афармлення дакументаў). Але і пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі, істотнай змены міграцыйнай палітыкі ён пакуль што невялікі. І гэта нягледзячы на сацыяльна-эканамічны і жорсткі экалагічны крызіс у Беларусі, запаволенасць яе пераходу да рыначных адносін, наяўнасць беспрацоўя, катастрафічнае зніжэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Калі ў 1988—1991 гг. з БССР эмігрыравала больш за 74 тыс. асоб (пры гэтым у 1990—1991 г. — больш за 56 тыс.), то ў 1992—1997 гг. за межы Рэспублікі Беларусь выехала на захад больш 50 тыс. чалавек [5]. У гэтыя гады выхадцы з Беларусі накіроўваліся ў Ізраіль (67 %), ЗША (36 %), Германію (4,6 %), Аўстралію, Польшчу, Канаду. Пры гэтым у заходнія краіны выязджалі пераважна суайчыннікі яўрэйскага паходжання, якіх няблага прымала гістарычная радзіма ці ўплывовая і багатая ў свеце дыяспара. Па даных пасольства Беларусі ў Ізраілі цяпер там пражывае ад 60 да 100 тыс. яўрэяў — выхадцаў з нашай краіны [6]. Аб запавольванні тэмпаў эміграцыі на захад, а затым павольным павелічэнні сведчаць лічбы табліцы 1.

*Табліца 1*

| Гады | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1992—1997 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Выехалі з Беларусі на Захад (чал.) | 9727 | 6901 | 6950 | 8780 | 8917 | 8891 | 50 166 |

Сяргеева Галіна Гаўрылаўна — кандыдат гістарычных навук, старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі

Тлумачыцца гэта многімі прычынамі, у тым ліку адсутнасцю сродкаў для першачарговага ўладкавання за мяжой, а таксама міграцыйнай палітыкай гэтых краін, якія абмяжоўваюць і жорстка кантралююць прыток перасяленцаў.

У новыя незалежныя дзяржавы на постсавецкай прасторы з 1992 па 1997 г. з Беларусі выехалі больш за 195 тыс. чалавек, з іх у Расію — 144 тыс., Украіну — 35 тыс., у краіны Балтыі — 4,7 тыс., Казахстан — 4 тыс., Сярэднюю Азію — больш за 3 тыс., Малдову і Закаўказзе — амаль па 2 тыс. [7] Пры гэтым характэрна запавольванне эміграцыі жыхароў Беларусі практычна ва ўсе новыя незалежныя дзяржавы. Пра дынаміку выезду ў гэтыя краіны з Беларусі ў гады яе незалежнасці дае ўяўленне табліца 2.

*Табліца 2*

| Гады | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1992—1997 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць эмігрантаў з Беларусі (чал.) | 50 837 | 46 889 | 47 746 | 26 102 | 14 045 | 9711 | 195 330 |

Аб папаўненні нацыянальнай дыяспары на постсавецкім абшары можна меркаваць толькі па даных з 1995 па 1997 г., калі афіцыйная статыстыка з патоку эмігрантаў пачала вылучаць беларусаў. Яны склалі менш за 30 % пакінуўшых Беларусь (7558 чал. у 1995 г., 4201 — у 1996 г., 3052 — у 1997 г., усяго 14 811 чал.). Пры гэтым у Расію накіраваліся 11 842 беларусаў (ці амаль 80 % эмігрыраваўшых), ва Украіну 2044 (каля 14 %), ва ўсе астатнія краіны — 925 чал. [8]

Пасля распаду СССР праявілася тэндэнцыя вяртання на бацькаўшчыну суродзічаў з новых незалежных дзяржаў, якая абумоўлена сацыяльна-эканамічнымі, нацыянальнымі, этнічнымі і іншымі прычынамі. З 1992 па 1997 г. Рэспубліка Беларусь прыняла з гэтых краін больш за 347 тыс. чалавек, у тым ліку каля 162 тыс. беларусаў, што складае 46,6 % [9] . Такім чынам, насельніцтва Беларусі ў міграцыйным абмене прырастае ў асноўным за кошт іншанацыянальных прадстаўнікоў, якія склалі 53,4 % ад усіх перасяліўшыхся ў 1992—1997 гг.

Дынаміку іміграцыі ў Беларусь з тэрыторыі экс-СССР (у тым ліку і беларусаў), яе зніжэнне з года ў год раскрывае табліца 3.

*Табліца 3*

| Гады | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1992—1997 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Перасяленцы ў Беларусь (чал.) | 117 697 | 85 971 | 50 043 | 33 301 | 30 069 | 29 955 | 346 991 |
| з іх — беларусы (чал.) | 54 327 | 40 610 | 23 977 | 15 919 | 13 555 | 13 459 | 161 847 |

Абумоўлена гэта пагаршэннем сацыяльна-эканамічнага становішча ў Беларусі, цяжкасцямі ўладкавання на бацькаўшчыне (прапіска, праца), прыстасаваннем часткі суродзічаў да новых умоў жыцця на постсавецкай прасторы.

На працягу 1992—1997 гг. з Расійскай Федэрацыі вярнуліся на бацькаўшчыну 97 157 беларусаў, Украіны — 22 013, краін Балтыі — 21 096, Казахстана — 9665, Сярэдняй Азіі — 5916, Закаўказзя — 4453, Малдовы — 4453 беларусаў [10] . Прыведзеныя даныя сведчаць, што найбольшы прыток беларусаў (адносна колькасці асеўшых там суродзічаў) назіраўся з краін Балтыі: адтуль выехала столькі, колькі з Украіны (з насельніцтвам у 5 разоў большым), і значна больш, чым з Сярэдняй Азіі, Закаўказзя, Малдовы разам узятых. Абумоўлена гэта немагчымасцю ці няпэўнасцю атрымання грамадзянства (Латвія, Эстонія), складанасцямі адаптацыі да новых умоў (асваенне дзяржаўнай мовы, без ведання якой нельга заняць пэўныя пасады ці нават проста знайсці працу). Калі ўлічыць, што ў 1995—1997 гг. з постсавецкага абшару ў Беларусь перасялілася 42 933 беларусаў, а выехала іх туды 14 811 чал., то за гэты час нацыянальная дыяспара зменшылася больш чым на 28 тыс. асоб.

Прытоку суродзічаў з постсавецкіх абшараў паспрыяла, хоць і запознена прынятае, права на набыццё грамадзянства Беларусі ў спрошчаным парадку (шляхам рэгістрацыі), якое атрымалі з 1993 г. асобы (а таксама муж ці жонка, іх нашчадкі), што пастаянна пражывалі на тэрыторыі рэспублікі, але выехалі за яе межы да ўвядзення ў дзеянне Закона аб грамадзянстве, маюць доказы сваей прыналежнасці да грамадзянства былога СССР і не сталі грамадзянамі іншай краіны. Рэалізацыя гэтага права прадугледжвалася законам да 1 студзеня 1996 г., а затым у 1995 г. тэрмін быў падоўжаны да 1 студзеня 1998 г. [11] Аднак нельга лічыць натуральным, што рэпатрыяцыя праходзіць без падтрымкі дзяржавы, якая не знаходзіць на гэта сродкаў і не разумее важнасці кансалідацыі карэннай нацыі. Пры ўдзеле адпаведных дзяржаўных органаў і іх падтрымцы адбылося вяртанне на радзіму толькі тысяч беларусаў-афіцэраў з "гарачых" рэгіёнаў былога Саюза. Аб жаданні многіх афіцэраў-землякоў, якіх лёс раскідаў па ўсіх былых рэспубліках СССР, вярнуцца на бацькаўшчыну сведчыць тое, што на чэрвень 1992 г. больш за 7 тыс. з іх прыслалі адпаведныя просьбы ў Вярхоўны Савет і Савет Міністраў [12] .

Праблемы рэпатрыяцыі вайскоўцаў вырашаюцца складана з прычыны не толькі сацыяльна-эканамічнага крызісу, скарачэння арміі, але і значнай колькасці ў новых незалежных дзяржавах беларускіх афіцэраў (па афіцыйных даных у расійскай арміі яны складаюць 3,8 %) [13] . У чэрвені 1996 г. міністр абароны Беларусі канстатаваў: "Міністэрства завалена просьбамі афіцэраў аб пераводзе ў Беларусь з Расіі, крыху менш — з Украіны" [14] . Беларусь тэрмінова павінна была вырашаць пытанне аб перасяленні сем'яў ваеннаслужачых запасу (у адстаўцы) і служачых Узброеных Сіл былога СССР — грамадзян Беларусі ў сувязі з тым, што ў Эстоніі, напрыклад, яны не маюць права не толькі на грамадзянства, але і на пражыванне. У верасні 1995 г. заключана пагадненне з Латвіяй аб парадку перасялення ў рэспубліку гэтай жа катэгорыі грамадзян Беларусі.

Тысячы беларусаў вяртаюцца на бацькаўшчыну ў якасці бежанцаў, найперш з тых дзяржаў на постсавецкай прасторы, дзе праявіліся нацыянальныя, этнічныя канфлікты, ускладнілася сацыяльная ці палітычная сітуацыя. Калі ў рэспубліцы ў 1992—1994 гг. паявілася 25 тыс. прэтэндэнтаў на статус бежанца, то ў 1998 г. іх ужо было больш за 30 тыс. з Сярэдняй Азіі, Закаўказзя, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Прыднястроўя і інш. [15] Больш паловы з

гэтага ліку складаюць асобы беларускага паходжання[16]. Беларусь прыняла Закон аб бежанцах (уступіў у сілу з 1 ліпеня 1995 г.), які адпавядае міжнародным канвенцыям і пактам [17]. Ён вызначае прававы статус бежанцаў, рэгулюе парадак яго набыцця і страты, устанаўлівае прававыя, эканамічныя і сацыяльныя гарантыі абароны бежанцаў на тэрыторыі Беларусі. Хоць паводле прынятых і ўступіўшых у сілу законаў і ўказаў ёсць магчымасць атрымаць статус бежанца і прытулак, у адпаведнасці з пастановай Кабінета Міністраў ад 20 чэрвеня 1995 г. вызначаны парадак выплаты грашовай дапамогі іншаземцам, якія падалі хадайніцтвы аб прызнанні іх бежанцамі, а таксама бежанцам, але фактычна ніякай падтрымкі яны не маюць. Да таго ж бежанцы-беларусы ці выхадцы з Беларусі, што вярнуліся на бацькаўшчыну, не ўкладваюцца ў класічнае азначэнне "бежанцы", а Закон аб бежанцах не дае ім ніякіх ільгот, пераваг перад іншымі прэтэндэнтамі на гэты статус. Перасяленцы сутыкаюцца з абыякавасцю ўлады, адсутнасцю помачы. Першай, зацягнуўшайся спробай вырашэння іх праблем на двухбаковай аснове стала пагадненне паміж урадам Беларусі і Расіі аб рэгуляванні працэса перасялення і абароне правоў перасяленцаў (падпісана ў 1996 г., ратыфікавана ў 1998 г.) [18]. Яно павінна прымяняцца да бежанцаў, працоўных мігрантаў і інш. Дзяржавы ў ім вызначылі права штогод устанаўліваць квоты на перасяленне, і толькі на іх распаўсюджваецца гэтае пагадненне.

У жыцці беларускай дыяспары можна адзначыць і непазбежнае нарастанне новай з'явы — наяўнасці значнай колькасці грамадзян Беларусі, якія стала пасяліліся за мяжой (у савецкі час гэта былі хіба што некалькі тысяч грамадзян БССР з ліку так званай "загсавай" эміграцыі). Заканадаўства Беларусі дае магчымасць захоўваць грамадзянства Беларусі пры пасяленні на сталае жыццё за мяжой, шлюбе, адкрывае мажлівасць вучобы, працы па кантракту і інш. Аб прызнанні ці атрыманні беларускага грамадзянства звяртаюцца суродзічы з новых незалежных дзяржаў, найчасцей асобы беларускага паходжання ў Латвіі, Эстоніі. Гэта звязана з тым, што ў адпаведнасці з заканадаўствам гэтых дзяржаў грамадзянства атрымалі толькі тыя, хто меў яго да 1940 г. і іх нашчадкі (дарэчы, незалежна ад нацыянальнасці). Каля трэці насельніцтва Латвіі аказаліся неграмадзянамі, у тым ліку 80 % беларусаў, якія жывуць у гэтай дзяржаве [19]. Праблемай для многіх суродзічаў — прэтэндэнтаў на грамадзянства Латвіі і Эстоніі — з'яўляецца неабходнасць здачы экзамена на веданне дзяржаўнай мовы, гісторыі і канстытуцыі краіны. Складаная працэдура атрымання грамадзянства ў Латвіі і Эстоніі, дзе вялікая доля рускамоўнага насельніцтва, успрымаецца імі як дыскрымінацыя, а ўладамі гэтых краін тлумачыцца як клопат пра будучыню карэннага народа, мера па стрымліванню русіфікацыі, стварэння ўплывовай прарасійскай фракцыі ў парламенце.

Па афіцыйных даных, на канец 1996 г. па-за Беларуссю стала пражывала больш за 7 тыс. яе грамадзян, якія зарэгістраваліся ў консульскіх аддзяленнях [20]. Звесткі гэтыя далёка не поўныя, бо многія грамадзяне працяглы час не звяртаюцца ў консульствы аб прызнанні свайго грамадзянства. Усё больш частымі становяцца выпадкі, калі беларусы эмігруюць з краін пражывання, але не вяртаюцца на бацькаўшчыну. Так, у 1997 г. з Літвы выехалі больш за 130 беларусаў, пераважна ў Расію і заходнія краіны [21]. Са спазненнем, толькі ў чэрвені 1998 г. зменамі Закона аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь спрошчаны парадак набыцця грамадзянства (неабавязковасць пастаяннага пражывання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на працягу апошніх 7 год, наяўнасці законнай крыніцы існавання) для асоб, якія нарадзіліся за межамі сучаснай тэрыторыі Беларусі, з'яўляюцца беларусамі (ці ідэнтыфікуюць сябе як беларусы), а таксама іх дзеці, унукі, праўнукі [22]. Асобны парадак устаноўлены для асоб, якія нарадзіліся за межамі сучаснай Беларусі і з'яўляюцца крэўнымі сваякамі (дзеці, унукі, праўнукі) грамадзян рэспублікі, якія пражывалі ў Беларусі да ўступлення ў сілу Закона аб грамадзянстве. Такія ж умовы прадастаўлены грамадзянам былога СССР, якія маюць высокія дасягненні ў навуцы, тэхніцы, культуры, спорце, або прафесію, кваліфікацыю, у якіх мае патрэбу Беларусь. Нямала суродзічаў на постсавецкім абшары, не дачакаўшыся гэтага закона і сутыкнуўшыся са складанасцямі атрымання ці вяртання беларускага грамадзянства, набылі расійскае ці іншае. Вастрыню праблемы набыцця суродзічамі грамадзянства ў новых незалежных дзяржавах Беларусь вырашае на аснове двухбаковых пагадненняў. Дарэчы, у ліку 9 краін—членаў СНД яна не падпісала Канвенцыю аб спрошчаным парадку набыцця грамадзянства грамадзянамі дзяржаў—удзельніц садружнасці, заключаную ў Маскве 19 студзеня 1996 г. і падпісаную толькі Расіяй, Казахстанам і Таджыкістанам. Канвенцыя дае права на рэгістрацыйны парадак атрымання грамадзянства на тэрыторыі адна адной пры пэўных умовах [23]. Для Беларусі далучэнне да яе можа азначаць значны прыток мігрантаў, дзеля ўладкавання якіх патрэбны вялікія сродкі.

У 1996 г. паміж Беларуссю і Казахстанам, а ў 1999 г. — з Украінай падпісаны пагадненні аб спрошчаным парадку атрымання грамадзянства. З утварэннем Супольніцтва Беларусі і Расіі (1996), іх Саюза (1997) бакі дэкларавалі роўныя правы сваіх грамадзян на тэрыторыі адна адной. Так, на першым пасяджэнні Парламенцкага сходу Супольніцтва Расіі і Беларусі (чэрвень 1996 г.) прынята пастанова аб статусе грамадзян яго дзяржаў-членаў. У адпаведнасці з ёй камісіям Парламенцкага сходу даручана ўнесці прапановы па замацаванню ў заканадаўствах Беларусі і Расіі гарантый свабоды перамяшчэння па тэрыторыях абедзвюх дзяржаў, роўных правоў пры атрыманні адукацыі, у ахове здароўя, працаўладкаванні, аплаце працы, сацыяльнай абароне, набыцці маёмасці, уключаючы жылыя памяшканні і іншую нерухомасць [24]. У студзені 1999 г. Беларусь ратыфікавала дагавор з Расійскай Федэрацыяй аб роўных правах грамадзян.

Свабодны выезд паставіў праблему прававой абароны грамадзян Беларусі, якія стала пражываюць у замежжы. Першымі крокамі на гэтым шляху сталі міжурадавыя пагадненні па абароне правоў сваіх грамадзян на тэрыторыі адна адной з сумежнымі дзяржавамі — Польшчай, Расіяй, Украінай, Літвой, а таксама з Казахстанам, Славакіяй, Кубай. Аб гарантыі правоў грамадзян у галіне пенсійнага забеспячэння заключаны пагадненні з Літвой (1994) і Малдовай (1995). Пагадненне аб гарантыях правоў грамадзян краін—удзельніц СНД у сферы пенсіённага забеспячэння падпісана ў 1992 г., у галіне аховы працы — у 1994 г. Уступленне ў сілу з 1997 г. пратакола да Канвенцыі аб прававой дапамозе і прававых адносінах па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах дае магчымасць ажыццяўляць сацыяльную абарону грамадзян, якія выязджаюць за межы Рэспублікі Беларусь або пражываюць у іншай краіне [25].

Складанае сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі, нестабільная праца большасці яе прадпрыемстваў, беспрацоўе абумовілі лішак рабочай сілы, якая не знаходзіць прымянення на ўнутраным рынку працы ці не згодна з неадпаведнай кваліфікацыі аплатай, узроўнем жыцця. Паводле сацыялагічных даследаванняў колькасць жадаючых выехаць на заробкі за мяжу вагаецца ад 15 да 45 % у залежнасці ад узроставай групы [26]. Экспарт рабочай сілы з Беларусі адбываецца найперш у памежныя дзяржавы — Польшчу, Расію, Літву, а таксама ў Германію, Чэхію, Славакію, Ізраіль, арабскія краіны, якія маюць патрэбу (найчасцей) у высокакваліфікаваных рабочых прафесіях (на будаўніцтве, лесараспрацоўках, сельгасработах, перавозках пасажыраў і грузаў). Амаль да сярэдзіны 90-х гг. адсутнічала прававая база для легальнага, сацыяльна абароненага ўладкавання нашых грамадзян на работах за мяжой, і значная колькасць жыхароў Беларусі працавала там на свой страх і рызыку. Падставай для вырашэння гэтай праблемы сталі спецыяльныя міжурадавыя пагадненні, у якіх акрэсліваецца кола праблем, у тым ліку ўмовы і парадак прыняцця на работу, сацыяльныя гарантыі (страхоўка і інш.). Так, пагадненнем паміж Беларуссю і Расіяй аб працоўнай дзейнасці і сацыяльнай абароне грамадзян на іх тэрыторыі (падпісана ў 1993 г., ратыфікавана ў 1994 г.) вызначаны парадак налічэння стажу, пенсій, урэгулявання праблем пры прафесійным захворванні, калецтве, часовай непрацаздольнасці, цяжарнасці і родах, інш. [27] Новыя ўмовы для працаўладкавання дэкларавалі Дагавор аб стварэнні Супольніцтва, а затым і Саюза Беларусі і Расіі: роўныя правы грамадзян пры ўладкаванні на працу, яе аплаце, прадастаўленне іншых сацыяльных гарантый. Пастановай Кабінета Міністраў Беларусі ад 1 жніўня 1996 г. з грамадзян Расіі фактычна зняты статус іншаземцаў, забараняецца якая-небудзь дыскрымінацыя іх пры прыёме на працу. Пры гэтым былі парушаны некалькі дзеючых заканадаўчых актаў, у тым ліку закон аб службе ў дзяржаўным апараце, якім замежным грамадзянам забараняецца працаваць у дзяржаўных, адміністрацыйных, рэжымных установах. Федэральная міграцыйная служба Расіі з 1996 г. змяніла дазвольны парадак працаўладкавання грамадзян Беларусі на яе тэрыторыі на рэгістрацыйны, што павялічыла прыток сюды новых работнікаў з Беларусі.

З улікам рынку свабоднай рабочай сілы Беларусь заключыла двухбаковыя пагадненні аб магчымасці ўзаемнага працаўладкавання і сацыяльнай абароны сваіх грамадзян з Польшчай, Украінай, Літвой, Малдовай, Казахстанам. Важным крокам па ўрэгуляванні і сацыяльнай абароненасці працоўных мігрантаў у заходнееўрапейскіх краінах стала падпісанае ў Брусэлі (6 сакавіка 1995 г.) і ратыфікаванае Вярхоўным Саветам Беларусі (12 красавіка 1995 г.) Пагадненне аб партнерстве і супрацоўніцтве Беларусі з Еўрапейскім супольніцтвам і яго дзяржавамі-членамі (Бельгія, Данія, ФРГ, Грэцыя, Іспанія, Францыя, Італія, Ірландыя, Люксембург, Нідэрланды, Аўстрыя, Партугалія, Фінляндыя, Швецыя, Злучанае каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі) [28]. Бакі гарантуюць, што абыходжанне з беларускімі грамадзянамі, якія легальна працуюць на тэрыторыі любой з дзяржаў—членаў Еўрапейскага супольніцтва, і адпаведна з грамадзянамі краін—членаў ЕС, якія легальна працуюць у Беларусі, "будзе пазбаўлена ўсялякай дыскрымінацыі па нацыянальнай прыкмеце, што датычыць умоў працы, аплаты ці звальнення". Пагадненнем прадугледжана каардынаванне сацыяльнага забеспячэння, у тым ліку акрэслены прынцыпы вызначэння пенсіі ў сувязі з узростам, інваліднасцю і смерцю, атрымання медыцынскай дапамогі легальнымі мігрантамі і інш. Бакі дэкларавалі, што прыкладуць сумесныя намаганні, каб узяць пад кантроль нелегальную эміграцыю, улічваючы прынцып і практыку другаразовага ўезду.

Паўнамоцным органам Беларусі па рэалізацыі пагадненняў аб супрацоўніцтве ў галіне працоўнай міграцыі і сацыяльнай абароны працоўных-мігрантаў прызначана ў чэрвені 1994 г. Дзяржаўная міграцыйная служба (з 1997 г. — Камітэт па міграцыі пры Міністэрстве працы) [29]. У складзе гэтага органа створана Упраўленне знешняй працоўнай міграцыі. Згодна з пастановай Кабінета Міністраў ад 21 жніўня 1995 г. Дзяржаўная міграцыйная служба пачала выдаваць ліцэнзіі як на прыцягненне замежнай рабочай сілы ў Беларусь, так і на працаўладкаванне яе грамадзян за мяжой. Было зарэгістравана некалькі дзесяткаў фірм, якія атрымалі дазвол на такі род дзейнасці і адпраўляюць людзей на заробкі ў Расію, Польшчу, Германію, Ізраіль, ЗША, краіны Блізкага Усходу. Фірма "Астрахан" (Мінск) атрымала права накіроўваць на будаўнічыя работы ў Маскву і Уфу, прапануюць работу ў Расіі мінская фірма "Вілената" і бабруйская "Дар". Сталічная фірма "Аміда" арганізуе выезд на працу ў Германію тынкоўшчыкаў-муляроў, а "Савекс" — у Чэхію на лесараспрацоўкі. Адсутнасць вопыту ўладкавання на працу за мяжой, недасведчанасць і даверлівасць грамадзян прыводзяць да таго, што яны нярэдка становяцца ахвярамі махлярства, злоўжыванняў нелегальных фірм (ці нават тых, што маюць адпаведныя ліцэнзіі). У Гродне раскрыты махінацыі і спынена нелегальная дзейнасць кааператыва "Каларыт" (1996) і фірмы "Мерана" (1997), прадухілены махінацыі маладзечанскай фірмы "Славянін" па вывазу 1,5 тыс. жыхароў Беларусі на будаўніцтва дарогі ў Бацване. У 1998 г. шэраг фірм былі пазбаўлены ліцэнзій з-за невыканання абумоўленых абавязацельстваў. Па даных Камітэта па міграцыі пры Міністэрстве працы напачатку 1999 г. ліцэнзіі на працаўладкаванне за мяжой мелі 74 суб’екты гаспадарання ў 12 гарадах (Мінску, Гомелі, Гродна, Брэсце, Віцебску, Магілёве, Пінску, Светлагорску, Смаргоні, Жодзіна, Бабруйску, Шчучыне).

Пэўнае, але далёка не поўнае ўяўленне аб памерах часовай працоўнай эміграцыі даюць лічбы тых, хто зарэгістраваў свае кантракты ў Міністэрстве працы: за межамі Беларусі ў 1994 г. — 1314 асоб, у 1995 г. — 1692, 1996 г. — 1894, у 1997 г. — 3226, у 1998 — 3692 асобы [30]. Але рэальна толькі ў Расіі за першае паўгоддзе 1996 г. работу знайшлі больш за 10 тыс. грамадзян Беларусі [31]. За першае паўгоддзе 1998 г. 334 жыхара Беларусі атрымалі дазвол на працу ў Польшчы [32]. Уладкоўваюцца працоўныя мігранты пераважна будаўнікамі, вадзіцелямі гарадскога транспарту ў Расіі, на сельскагаспадарчых работах, ніжэйшых прыступках сферы абслугоўвання ў Польшчы, іншых дзяржавах.

На паліўна-энергетычным комплексе Расіі працуе ад 5 да 8 тыс. беларускіх вахтавікоў (так званая маятнікавая міграцыя), якіх прываблiваюць традыцыйна высокія заробкі [33]. Але ў апошнія гады іх становішча моцна ўскладнілася ў сувязі са скарачэннем здабычы нафты ў Расіі і павелічэннем беспрацоўя, невысокай аплатай працы і затрымкамі з яе выплатай, няпэўнымі перспектывамі на будучыню. Беларускія будаўнічыя арганізацыі ў пошуках працы выходзяць на рынак Расіі. Вяр-

хоўны Савет Беларусі адмяніў у 1996 г. падатак на дабаўленую вартасць (каб пазбегнуць двайнога падаткаабкладання) на будаўнічыя работы за межамі рэспублікі, тым самым значна палепшыў іх эканамічнае становішча. Беларускія будаўнікі ўзвялі шэраг аб'ектаў у Маскве і Падмаскоўі, у гарадах Варонеж, Багучараў, Пятрова-Дальняе Расійскай Федэрацыі [34]. Танная рабочая сіла, добрая кваліфікацыя, дысцыплінаванасць дазваляюць беларускім работнікам укараніцца ў некаторых сферах на замежным рынку працы і такім чынам захаваць працоўны патэнцыял, кваліфікацыю, прывезці з-за мяжы лепшыя тэхналогіі і заробкі.

Ва ўмовах эканамічнага крызісу, адсутнасці рэформ і павароту ўлады да адміністратыўна-каманднага кіравання працоўная міграцыя — гэта выйсце, але ўсё ж не для большасці жыхароў краіны. Па неафіцыйных ацэнках, цяпер за межамі Беларусі працуюць да 100 тыс. чалавек. Праявілася ўстойлівая тэндэнцыя павелічэння дыяспары (у асноўным па эканамічных матывах) за кошт здольных, творчых, перспектыўных, прагматычных, высокапрафесійных выхадцаў з Беларусі. Улады ж яе пакуль не прымаюць эканамічных мер для стрымлівання адтоку за мяжу інтэлектуальнай, навуковай, культурнай, спартыўнай эліты дзяржавы. Не праяўляецца клопат аб захаванні нацыянальнага генафонду, засцярогі з нагоды "уцечкі розуму" і "залатых рук", практычна за свой кошт дзяржава рыхтуе добрых спецыялістаў для іншых краін. Праўда, ёсць і станоўчы бок гэтага: паехаўшыя найчасцей могуць плённа рэалізаваць свае магчымасці, захаваць прафесійны ўзровень, палепшыць дабрабыт.

Па даных апытання, праведзенага Інстытутам сацыялогіі Акадэміі навук Беларусі сумесна з Дзяржаўнай міграцыйнай службай, каля 300 навукоўцаў і выкладчыкаў ВНУ (з іх — амаль палова дактары і кандыдаты навук) выехалі ў 1991—1995 гг. у ЗША (38 %), Ізраіль (32 %), Расію (10 %), Германію (7 %), Канаду (3 %) [35]. У ЗША пражываюць спевакі Л. Барткевіч, В. Пархоменка, А. Забора, кампазітар З. Яўтуховіч, мастак Ю. Пучынскі, акцёры Р. Харык, Р. Маленчанка, А. Караблёў, піяніст Л. Кузьмін, гітарыст А. Растопчын, у Італіі — оперная спявачка М. Гулегіна, у Францыі — мастакі Б. Забораў, М. Паўлоўскі, спявак А. Валодась, скрыпачка Л. Колас, у Германіі — скрыпач А. Крамараў, Англіі — мастак В. Мартынчык, Аўстрыі — мастачка З. Літвінава, Чэхіі — паэт С. Сокалаў-Воюш, Польшчы — мастак С. Захарынскі, Ізраілі — музыкант Л. Тышко і інш.

У апошнія гады прычынай сталай ці часовай эміграцыі становяцца не толькі эканамічныя матывы, але і непрыманне палітычнай сітуацыі ў Беларусі, адносінаў дзяржаўных структур да нацыянальнай культуры. Першыя палітычныя эмігранты атрымалі прытулак у ЗША, Чэхіі, Польшчы. "Некамфортна цяпер у Беларусі многім, — заўважае мастак С. Захарынскі, — у першую чаргу творцам — паэтам, музыкантам, мастакам, артыстам. Беларуская культура — сума індывідуальнасцяў, а гэтыя "індывідуальнасці" спрабуюць зноў нівеліраваць "зверху", падзяліць на сваіх і чужых як уладатрымальнікі, так і самі творцы. Але ж нам патрэбны моцная, цэльная нацыя і сучасная дэмакратычная дзяржава, за якую не трэба было б саромецца" [36].

З 1993 па 1997 г. Беларусь пакінулі ці выехалі на працу па кантракту 220 перспектыўных спартсменаў і больш за 100 трэнераў [37]. У апошні час неспрыяльныя ў дзяржаве падатковыя, інвестыцыйныя ўмовы гаспадарання выштурхоўваюць у іншыя краіны людзей прадпрымальных, як і іх капіталы. Так, на працягу 1997 г. дэпартамент эміграцыі МУС Чэхіі выдаў візы на пастаяннае жыхарства некальікім сотням беларускіх бізнесменаў, якія перанеслі сваю дзейнасць на тэрыторыю Чэшскай Рэспублікі [38]. Па ацэнцы апазіцыйных палітыкаў, напрыканцы 1998 г. больш за 30 тыс. грамадзян вялі свой бізнес у Расіі, ва Украіне, у Польшчы, Чэхіі, Прыбалтыцы, паляпшаючы дабрабыт гэтых дзяржаў [39]. Ці асэнсоўваюць улады Беларусі вынікі таго, што ў патоку эмігрантаў краіну пакідае найбольш прафесійны кантынгент? Эксперты прадказваюць, што гэта адна з прычын змяншэння ў бліжэйшы час працоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу дзяржавы [40]. Безумоўна, нельга вяртацца да закрытага грамадства (як было ў СССР), пазбаўляць асобу права жыць, працаваць там, дзе яна хоча (нават у імя росквіту краіны ці якой іншай высакароднай мэты), але шукаць эканамічныя шляхі вырашэння гэтай праблемы на карысць народа неабходна.

Вышэйзгаданыя тэндэнцыі прывялі да папаўнення беларускіх замежных арганізацый новымі сябрамі, ажыўлення працы беларускіх асяродкаў у ЗША, Чэхіі, Канадзе і інш. Як заўважыў вядомы ў эміграцыі і на бацькаўшчыне дзеяч Я. Запруднік, у Нью-Йоркскім аддзеле Беларуска-амерыканскага задзіночання на 60 % — новыя людзі [41].

Новая з'ява ў жыцці дыяспары — папаўненне яе нелегальнай, некантралюемай эміграцыяй, найчасцей часовай. Па меркаванні даследчыкаў, колькасць тых, хто ўладкоўваецца такім чынам за мяжой (без дазволу на пражыванне і працу), вызначаецца ўжо не тысячамі, а дзесяткамі тысяч (летам 1998 г. — амаль 50 тыс.) [42]. Нягледзячы на абарону большасці заходніх краін ад наплыву мігрантаў, дэпартацыю нелегальных працаўнікоў, яны ўладкоўваюцца чорнарабочымі, хатнімі работнікамі, у агародніцтве, сферы абслугоўвання, працуюць на самых разнастайных, але найчасцей на нізкааплатных сезонных работах. Павялічваецца выезд на часовыя заробкі ў Расію, іншыя краіны без кантрактаў, часамі па папярэдняй дамоўленасці, а найчасцей і без яе. "Ненатуральна танныя беларускія рабочыя на нелегальным рынку працы Расіі, — падкрэслівае расійскі эканаміст О. Лацiс, — і ненатуральна танныя беларускія тавары на маскоўскіх рынках даўно ўжо служаць неабвержным доказам цяжкай хваробы беларускай эканомікі" [43]. Пры гэтым нелегалы сацыяльна неабароненыя (пры аплаце працы, захаванні тэхнікі бяспекі і інш.). Гаспадары, якія выкарыстоўваюць іх працу, рызыкуюць (бо не плацяць падатку, страхоўкі, адлічэння на пенсіі), але маюць з гэтага выгаду (мала плацяць, не клапоцяцца аб умовах працы і быту, не маюць праблемы з паслухмянасцю, выкідваюць пры першай нязгодзе). Сродкі масавай інфармацыі прыводзяць шмат выпадкаў поўнага бяспраўя, падману, шантажу, калецтва ці нават смерці нелегальных працаўнікоў у Польшчы, Расіі і іншых месцах. Нелегальная міграцыя звязана і з такімі адмоўнымі з'явамі, як наркабізнес, прастытуцыя, грабяжы. У Германіі былі скандальныя гісторыі, калі паехаўшыя за "легкім" заробкам беларускія дзяўчаты траплялі ў становішча рабынь. У поле зроку гандляроў "жывым таварам", частка якіх актыўна дзейнічае ў Польшчы, трапляюць і суайчынніцы, якія "практыкуюць" у гэтай і іншых краінах. Некаторых з жанчын прымусілі стаць прастытуткамі шляхам падману, бо наймалі іх на зусім іншую працу [44].

Разуменнем важнасці, неабходнасці асэнсаванай палітыкі ў галіне эміграцыі-іміграцыі стала прынцце

пастановай Савета Міністраў Беларусі ад 8 красавіка 1998 г. Дзяржаўнай міграцыйнай праграмы, кантроль за выкананнем якой ускладзены на міжведамасную камісію па пытаннях міграцыі пры Савеце Міністраў [45]. У ёй асаблівая ўвага надаецца рэалізацыі закона "Аб бежанцах", больш эфектыўнаму супрацоўніцтву з суседнімі і іншымі дзяржавамі і ў сферы кантроля за міграцыяй, папярэджванню і выкараненню незаконнай міграцыі. Адным з прававых актаў па рэалізацыі гэтай праграмы стаў прыняты ў чэрвені 1998 г. закон "Аб знешняй працоўнай міграцыі", які вызначае парадак выезду грамадзян Беларусі для працы за мяжу, прыцягнення іншаземнай рабочай сілы ў рэспубліку, юрыдычныя нормы абароны працоўных мігрантаў [46]. У законе вызначаны тэрміны "знешняя працоўная міграцыя", "маятнікавая " ("прыгранічная"), "працоўны-мігрант", "прыгранічны працоўны", уведзены прынцыпы квотаў для працоўных-мігрантаў, заключэння імі працоўнага дагавора і забеспячэння дзяржавамі роўнасці сацыяльных правоў, прадухілення нелегальнай працоўнай міграцыі і інфармацыі, якая ўводзіць у зман.

Беларусь апошнім часам робіць больш рэальныя захады па вырашэнні праблем міграцыі супольна з іншымі дзяржавамі. У пагадненні аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў пытанні міграцыйнай палітыкі аднесены да сферы сумеснай дзейнасці, "рэалізуемай на раўнапраўнай аснове праз каардынуючыя інстытуты Садружнасці" [47]. У дагаворах паміж Рэспублікай Беларусь і Узбекістанам (1991), Кыргызстанам (1991), Расійскай Федэрацыяй (1995) і інш. бакі прызналі мэтазгодным аб’яднанне намаганняў па пытаннях міграцыйнай палітыкі і ўзаемадзеянне ў барацьбе з нелегальнай міграцыяй [48].

Беларусь стала членам міжурадавай Міжнароднай арганізацыі па міграцыі (у снежні 1996 г. у Мінску адкрылася яе прадстаўніцтва), прымае ўдзел у Кансультацыйным савеце па працы, міграцыі і сацыяльнай абароне насельніцтва дзяржаў—удзельніц СНД (1996), падпісала ў 1998 г. Пагадненне краін СНД аб супрацоўніцтве ў барацьбе з незаконнай міграцыяй (ратыфікавана Беларуссю ў 1999 г.).

Дапамогу Беларусі ў вырашэнні складаных праблем міграцыі, якія часта носяць міжнародны характар, аказвае адкрытае ў верасні 1995 г. у Мінску Прадстаўніцтва Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў. Урад Беларусі прызначыў свайго паўнамоцнага прадстаўніка ў Адміністратыўны савет Міждзяржаўнага фонду дапамогі бежанцам і вымушаным перасяленцам. Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў, Прадстаўніцтва ААН і Міжнародная арганізацыя па міграцыі наладзілі ў 1996 г. семінар для супрацоўнікаў міністэрстваў і ведамстваў Беларусі па пытаннях міграцыі і бежанцаў (аналагічныя семінары праведзены ў Літве і Эстоніі). Ён паспрыяў азнаямленню канкрэтных кіраўнікоў з міжнародным гуманітарным правам і правамі бежанцаў, практыкай іх ажыццяўлення ў краінах Заходняй Еўропы. Да нявырашаных праблем трэба аднесці тое, што да гэтага часу ў рэспубліцы не падпісаны Міжнародная канвенцыя па абароне правоў працоўных мігрантаў, Еўрапейская канвенцыя аб прававым стане рабочых-мігрантаў (1977), канвенцыя "Аб злоўжываннях у галіне міграцыі і забеспячэнні працоўным мігрантам роўнасці магчымасцей" (1975). Не адрэгуляваны правы замежных суродзічаў, хаця ўжо распрацоўваецца закон аб суайчынніках, якія жывуць за мяжой. Ён павінен юрыдычна замацаваць правы і льготы суродзічаў, якія прадаставіць ім бацькаўшчына (гэта можа быць палёгка ў адносінах набыцця маёмасці, большае спрыянне прадпрымальнікам, інвестарам з беларускай дыяспары і інш.). Дзяржава абавязана прызнаць пэўныя правы дзеля захавання іх інтарэсаў у краіне іх паходжання, гістарычнай радзіме. Адно з такіх правоў — права на рэпатрыяцыю і дзяржаўную падтрымку ў гэтым суродзічаў з новых незалежных дзяржаў, якія жадаюць вярнуцца на бацькаўшчыну (дапамога ў працаўладкаванні, прапісцы, крэдытаванні пры набыцці жылля і інш.).

Абароне правоў замежных суайчыннікаў спрыяюць міжнародныя дагаворы аб узаемаадносінах Беларусі з Польшчай, Расіяй, Украінай, Кыргызстанам, Узбекістанам, якія ўтрымліваюць артыкулы аб магчымасці свабоднага выяўлення, захавання і развіцця суайчыннікамі этнічнай, культурнай, моўнай, рэлігійнай самабытнасці. Першае міжурадавае пагадненне аб абароне інтарэсаў суродзічаў Беларусь падпісала з Малдовай (1997), такія пагадненні рыхтуюцца з памежнымі дзяржавамі — Украінай, Расіяй, Літвой.

З набыццём самастойнасці Беларусь ажыццяўляе свае візавую палітыку, якая аказвае значны ўплыў на самаадчуванне замежных суродзічаў, іх повязі з бацькаўшчынай, а таксама на працэсы міграцыі. Пасля распаду СССР эміграцыі-міграцыі паспрыяла пагадненне аб бязвізавым перамяшчэнні грамадзян СНД па тэрыторыях яе ўдзельнікаў (кастрычнік 1992 г.). Да 1993 г. Беларусь ужо мела дагаворы з 11 краінамі па бязвізаваму перамяшчэнню (Чэхія, Славакія, Польшча, Балгарыя, Венгрыя, Куба, Македонія, Боснія і Герцагавіна, Сербія і Чарнагорыя, Манголія). Беларусь і Польшча спрасцілі парадак перасячэння мяжы для жыхароў прыгранічных населеных пунктаў: Кабінет Міністраў Беларусі ў лістападзе 1995 г. прыняў пастанову "Аб правапераемстве ў дачыненні Пагаднення паміж СССР і ПНР аб спрошчаным парадку пропуску цераз дзяржаўную мяжу жыхароў прыгранічных населеных пунктаў, якое было заключана ў маі 1985 г.". Пагадненнем паміж урадамі Беларусі і Кубы аб узаемных бязвізавых паездках грамадзян (1997) вызначана, што тыя з іх, што прыязджаюць на тэрмін больш за 30 дзён, на пастаяннае жыхарства ці па працоўнаму кантракту, павінны мець візу адпаведнай дзяржавы [49]. Да 1993 г. на 8 краін распаўсюджваўся візавы рэжым (КНДР, КНР, Індыя, Літва, Латвія, Румынія, Турцыя, Іран). Са студзеня 1996 г. да ўзаемнага візавага рэжыму перайшлі Беларусь са Славеніяй і Харватыяй. З памежных з Беларуссю дзяржаў візавы рэжым увялі Латвія (1993), Эстонія (1993), Літва (1994), а з 1 жніўня 1998 і Польшча (гэта адна з умоў яе прыняцця ў Еўрапейскі саюз). Але з улікам наяўнасці ў памежных з Беларуссю дзяржавах этнічных беларусаў для пэўных іх катэгорый зроблены выключэнні, прадастаўлены льготы. З 1994 г. дзейнічае беларуска-літоўскае пагадненне аб спрошчаным парадку (па прапусках) перасячэння дзяржаўнай мяжы жыхарамі прыгранічных тэрыторый [50]. Права на бязвізавае перасячэнне мяжы маюць і тыя, хто працуюць ці вучацца ў Беларусі, асобы, якія старэй за 60 гадоў [51]. Паміж дзяржавамі заключана пагадненне, што асобы, якія дакументальна пацвердзілі сваё паходжанне з Беларусі і маюць тут блізкіх сваякоў, атрымліваюць пасведчанне на права шматразовага наведвання бацькаўшчыны тэрмінам да двух гадоў. Для атрымання такога пасведчання яны афармляюць шматразовыя беларускія візы праз Пасольства Беларусі ў Літве.

Аналагічная практыка існуе паміж Беларуссю і Латвіяй. Але ёсць і асаблівасці, якія вынікаюць з існавання ў суседняй дзяржаве вялікай колькасці беларусаў-неграмадзян (цяпер іх 80 тыс.). Беларусь дамаглася падаўжэння да 1 студзеня 1998 г. бязвізавага ўезду на бацькаўшчыну асобам без грамадзянства, якія мелі пашпарты былога СССР з адзнакай Рэгістра сталага жыхара Латвіі. Тыя, хто маюць пасведчанне неграмадзяніна, павінны атрымоўваць беларускія візы, але і для гэтай катэгорыі ўстаноўлены адпаведныя льготы (права на набыццё шматразовай гадавой візы, калі ў Беларусі ў іх пражываюць блізкія сваякі ці калі яны валодаюць тут уласнай нерухомасцю). Такое ж права маюць і грамадзяне Латвіі (сярод іх больш за 20 тыс. беларусаў) пры наяўнасці ў іх блізкіх сваякоў у Беларусі. З 1 красавіка 1996 г. для асоб без грамадзянства зніжана аплата за шматразовую гадавую і транзітную візы. Бясплатныя візы выдаюцца ў сувязі са смерцю блізкіх ці наведваннем могілак сваякоў.

Больш складаная сітуацыя ў суродзічаў Эстоніі. "Упэўнена, што не толькі я адна, — адзначае эстонская беларуска Я. Харытоненка, — але многія не згодны з тым, што нам патрэбна віза. Пакуль што я не маю ніякага грамадзянства, атрымліваю візу, якая каштуе 10 долараў толькі на месяц. Яшчэ больш крыўдна становіцца ад таго, што ўкраінцы, рускія, якія таксама не маюць ніякага грамадзянства, гэтак жа, як і мы, але едуць на сваю бацькаўшчыну без візы. Цікава, што ў Расію я магу ехаць без візы... Калі падумаеш без прадузятасці пра візавы рэжым у Эстоніі, то, можа, так яно і павінна быць. Але ж беларусы ў нас галоўным чынам людзі ўжо ва ўзросце, на пенсіі" [52].

Што тычыцца заходнееўрапейскіх краін, то для грамадзян Беларусі і іншых краін СНД патрэбна віза для ўезду на тэрыторыю дзяржаў Шэнгенскага саюза, але, атрымаўшы візу ў адным з пасольстваў, можна перамяшчацца па тэрыторыі 10 еўрапейскіх краін — Аўстрыі, Бельгіі, Германіі, Галандыі, Грэцыі, Іспаніі, Італіі, Люксембурга, Партугаліі і Францыі.

Такім чынам, юрыдычнае права на свабодны ўезд і выезд з Беларусі яе грамадзян, заканадаўча замацаванае ў якасці аднаго з асноўных правоў асобы, практыка яго рэалізацыі абумовілі натуральнае папаўненне заходняй дыяспары, вяртанне суродзічаў на бацькаўшчыну з новых незалежных дзяржаў на тэрыторыі былога СССР. Пэўную частку дыяспары складаюць часовыя працоўныя эмігранты, у тым ліку і нелегальныя. Беларусь зрабіла пэўныя захады на падставе міжнародных, міжурадавых пагадненняў па рэгуляванню міграцыйных працэсаў, вырашэнню пытанняў сацыяльнай абароненасці грамадзян за мяжой. Намеціліся пэўныя зрухі ў падрыхтоўцы заканадаўчых актаў, якія паўплываюць на жыццё замежных суайчыннікаў і адпаведна на стан дыяспары. Але пакуль яны яшчэ не даюць дастатковых гарантый для замежных беларусаў, асабліва на постсавецкай прасторы, іх сацыяльнай абароны, магчымасцей для іх наступнага вяртання і ўключэння ў працоўны працэс на бацькаўшчыне. Змяніліся адносіны да выезду грамадзян Беларусі за мяжу на працу, і дзяржава зрабіла першыя крокі па наданню працэсу заканадаўча аформленых, цывілізаваных форм.

Павелічэнне разрыву жыццёвага ўзроўню жыхароў Беларусі ў параўнанні з іншымі краінамі пагражае павелічэннем эміграцыі, стратамі інтэлектуальнага і працоўнага патэнцыялу. Папаўненне, такім чынам, дыяспары, паяўленне ў ёй значных творчых сіл, кваліфікаваных працаўнікоў патрабуе іншага зместу і ўзроўню ўзаемадзеяння на дзяржаўным і грамадскім узроўні з замежнымі грамадзянамі Беларусі і суродзічамі.

---

[1] Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1991. № 32. Арт. 421.
[2] Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1993. № 22. Арт. 274.
[3] Збор пастаноў урада Рэспублікі Беларусь. 1993. № 23. Арт. 449.
[4] Падлічана па: Республика Беларусь в цифрах: Стат. зб. Мн., 1997. С. 33; Основные итоги миграции населения Республики Беларусь: Стат. зб. Мн., 1998. С. 29.
[5] Республика Беларусь в цифрах. 1997: Стат. зб. С. 33, 50.
[6] Белорусская деловая газета. 1996. 26 августа.
[7] Падлічана па: Население Республики Беларусь: Стат. зб. Мн., 1997. С. 167—168; Основные итоги миграции населения Республики Беларусь: Стат. зб. С. 29.
[8] Падлічана па: Республика Беларусь в цифрах: Стат. зб. Мн., 1997. С. 33.
[9] Падлічана па: Республика Беларусь в цифрах. 1993: Стат. зб. Мн., 1994. С. 61—62; Республика Беларусь в цифрах. 1995: Стат. зб. Мн., 1996. С. 35; Основные итоги миграции населения Республики Беларусь: Стат. зб. С. 30.
[10] Падлічана па: Население Республики Беларусь. 1994: Стат. зб. Мн., 1995. С. 411—418; Население Республики Беларусь. 1995: Стат. зб. Мн., 1996. С. 176—177. Население Республики Беларусь: Стат. зб. Мн. 1997. С. 172—173; Основные итоги миграции Республики Беларусь. С. 30.
[11] Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1995. № 32. Арт. 421.
[12] Там жа. 1992. № 21. Арт. 344.
[13] Звязда. 1995. 22 верасня.
[14] Там жа. 1996. 22 чэрвеня.
[15] Звязда. 1994. 14 кастрычніка; 1996. 27 сакавіка.
[16] Звязда. 1996. 5, 19 красавіка; Беларусь: среда для человека. Мн., 1996. С. 48.
[17] Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1995. № 19. Арт. 229.
[18] Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. 1998. № 18. Арт. 211.
[19] Звязда. 1995. 9 верасня.
[20] Звязда. 1996. 29 мая.
[21] Свабода. 1997. 28 кастрычніка.
[22] Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. 1988. № 25—26. Арт. 432.
[23] Гл.: Содружество. 1996. № 1 (21). С. 76—80.
[24] Звязда. 1996. 25, 26 чэрвеня.
[25] Звязда. 1998. 13 сакавіка.
[26] Звязда. 1996. 26 чэрвеня.
[27] Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1994. № 28. Арт. 497.
[28] Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1996. № 1-2. С. 3—71.
[29] Збор пастаноў урада Рэспублікі Беларусь. 1994. № 17-18. Арт. 361.
[30] Звязда. 1996. 26 верасня; Там жа. 1998. 28 ліпеня; Голас Радзімы. 1999. 25 сакавіка.
[31] Звязда. 1996. 5 верасня.
[32] Навіны. 1998. 23 снежня.

[33] Свободные новости. 1996. Апрель.
[34] Звязда. 1997. 8 жщуня.
[35] Звязда. 1996. 8 кастрычшка.
[36] Там жа. 11 кастрычшка.
[37] Белорусская газета. 1998. 6 апреля; Белорусская деловая газета. 1998. 28 декабря.
[38] Свабода. 1997. 2 верасня.
[39] Народная воля. 1998. 3 кастрычшка.
[40] Беларусь: среда для человека. Национальный отчет о человеческом развитии '96. Мн., 1997. С. 47.
[41] Голас Радзімы. 1998. 19 лютапада.
[42] Звязда. 1998. 28 лшеня.
[43] Известия. 1996. 15 декабря.
[44] Звязда. 1996. 17 мая.
[45] Збор дэкрэтау, указау прэзщэнта і пастаноу урада Рэспублт Беларусь. 1998. № 10. Арт. 284.
[46] Ведамасщ Нацыянальнага сходу Рэспублт Беларусь. 1998. № 25—26. Арт. 430.
[47] Ведамасщ Вярхоунага Савета Рэспублш Беларусь. 1992. № 6. Арт. 121.
[48] Там жа. 1993. № 16. Арт. 195; 1995. № 24—25. С. 39.
[49] Ведамасщ Нацыянальнага сходу Рэспублш Беларусь. 1998. № 17. Арт. 204.
[50] Народная газета. 1994. 1 красавжа.
[51] Прамень. 1996. Лшень. № 7.
[52] Звязда. 1994. 9 верасня.

## SUMMARY


The article "State Migration Policy of Belarus and Its Influence on Modern Diaspora (the 90s)" analyses the legal foundation of the formation of national migration policy after independence was declared in Belarus: the Law of the Citizenship of the Republic of Belarus (October 1991, with the amendments of 1993, 1995 and 1998 on granting citizenship to certain categories of countrymen and other persons from the post-Soviet territory), the Law on the Procedure of Departure and Entry in the Republic of Belarus (in force from January 1, 1994), the Constitution of the Republic Belarus (1994), the Law on Refugees (in force from November 1995), the Law on Migrant Workers (1998) etc. Light is shed on the shaping of state regulation mechanism for migration, refugee rights protection and working migration. The state migration office set up under the State Committee for Labour and Social Security in 1993 was later, in January 1997, transformed into the Committee on Migration under the Ministry of Labour. Regional and Minsk city offices are also active. In 1998 a State programme on migration was adopted by the government.

The legal right to free entry to and departure from Belarus by its citizens has been formulated in legislation as one of basic human rights. Its practical realization was determined by two opposite trends: the numerical growth of western diaspora and the reduction of the number of Belarusian countrymen on the post-Soviet territory. The flow of migrants of Belarusian extraction to the US, Israel, Germany, Australia, Canada and Poland was relatively small (more than 40,000 people in 1992—1994) but the immigration from these countries to Belarus is extremely low. After the collapse of the USSR due to a number of reasons (socio-economic, natural, ethnic etc.) Belarus admitted in 1992—1997 247 thousand people, 162 thousand of them Belarusians (46.6 %), from the territory of the former Soviet Union; whereas 195 thousand people left Belarus, including 15 thousand people in 1995—1997. In 1995—1997 only, when the process of migration decreased, Belarusian national diaspora on the post-Soviet territory was reduced by 28 thousand Belarusians.

The article emphasises that Belarusian diaspora has acquired a new category: emigrants who have retained Belarusian citizenship and also temporary migrant workers including the illegal ones. Taking this into account, Belarus signed international state agreements with a number of countries on regulating migration process (Russia, Lithuania), on resolving the issues of legal and social protection of the citizens of Belarus abroad (Poland, Russia, Ukraine, Lithuania, Kazakhstan, Slovakia, Cuba); the agreements on mutual employment of their citizens (Poland, Ukraine, Lithuania, Moldova, Kazakhstan, Mongolia). Together with a number of states Belarus has introduced into international treaties the articles on protection of rights of its countrymen (on the possibility of free retaining and development of ethnic, cultural, linguistic and religious identity). The analysis of the emigration-immigration flows shows a sizeable brain drain of qualified professionals and the enrichment of the diaspora (especially the western one) by promising, creative migrants of high ability. In connection with the intensive emigration of academic, cultural, entrepreneurial and sports elite — "the golden hands" — (mainly for economic reasons) and the appearance of first political emigrants experts forecast the reduction of working and intellectual potential of the nation and the depletion of national gene fund in near future.

The article suggests real measures for resolving migration issues in collaboration with other countries. It analyses the impact of the visa policy of Belarus and other countries on the feelings of the countrymen abroad and their links with the motherland. The article also notes the positive influence of the recent migration policy of Belarus on the state of the diaspora but so far the state does not provide real sufficient guarantees of legal and social protection for Belarusians, persons of Belarusian extraction on the post-Soviet territory and for the possibility of their return and participation in the work on their native land.

The article concludes that widening of the gap between the living standards of the people in Belarus and many other countries threatens with emigration growth and the reinforcement of the diaspora by creative skilled professionals requires a different level and content of the interaction between the state and society in Belarus and the citizens and countrymen of Belarus abroad.